# ВОСТРЫМ СЛОВАМ НАБЛІЖАЎ ПЕРАМОГУ

24 чэрвеня 1941 года Кузьма Чорны пакінуў ахоплены пажарам Мінск. У Крычаве ён з'явіўся ў ваенкамат і стаў байцом Чырвонай Арміі. Але ў хуткасці быў адкліканы. У пасведчанні чытаем: "Военнообязанному запаса Романовскому Н. К. предоставлена отсрочка от призыва по мобилизации в Красную Армию на время войны как работающему при редакции ЦК КП(б) Беларуси в должности работника по выпуску агитплакатов". К. Чорны прасіўся паслаць яго ў акупіраваную Беларусь, каб змагацца з ворагам разам з народнымі мсціўцамі, але просьба была адхілена: не тое здароўе.

Да жніўня 1941 года ў Гомелі К. Чорны ўдзельнічаў у выданні малым фарматам газеты "Звязда". Аднак у верасні 1941 года ў невялічкім горадзе Болхаў Арлоўскай вобласці, дзе стаялі цэлы месяц, у сувязі са складаным становішчам выданне газет "Звязда" і "Советская Белоруссия" спыняецца. Аб'яднаныя журналісцкія сілы двух калектываў пачалі выдаваць газету "Савецкая Беларусь" на беларускай мове для насельніцтва акупіраваных раёнаў рэспублікі.

Мікалай Карлавіч быў назначаны загадчыкам літаратурнага аддзела, сакратаром – Павел Кавалёў. Ён успамінаў: "З верасня 1941 года і да самага вызвалення Беларусі К. Чорны працаваў у газеце "Савецкая Беларусь". І працаваў так старанна і сумленна, што можна было параўнаць яго працу з працаю салдата-франтавіка, рабочага каля станка. Супрацоўнікі не могуць прыпомніць ніводнага выпадку, каб Мікалай Карлавіч спазніўся на працу ў рэдакцыю, ці гэта гады, калі былі ў маленькім гарадку, ці тады, калі ў Маскве на плошчы Пушкіна, у будынку рэдакцыі газеты "Известия", дзе рэдакцыі "Савецкай Беларусі" былі адведзены два невялікія пакойчыкі.

Прыйшоўшы ў рэдакцыю, К. Чорны з усімі ветліва вітаўся, быў з кожным уважлівым. Садзіўся за рабочы стол і схіляўся да матэрыялаў чарговага нумара газеты".

Падрыхтаваныя К. Чорным матэрыялы да апублікавання ніколі не затрымліваліся і не вярталіся для дапрацоўкі. А на лятучцы адзначаліся як узорныя і па змесце, і па літаратурнай апрацоўцы. Асаблівую ўвагу праяўляў да дакументаў, расказаў відавочцаў, якія траплялі ў рэдакцыю з акупіраваных раёнаў Беларусі. А ў выніку адзін за адным пісаліся вострыя памфлеты аб "новым парадку", аб гаспадаранні фашыстаў на нашай зямлі, аб нечуваных зверствах над малымі і старымі. Вось толькі некаторыя з іх "Душа в штанах", "В разведке", "Кружевное прикрытие", "Как немец на свинье в вечный покой въехал", надрукаваныя ў агітплакаце "Раздавим фашистскую гадину", падпісаныя псеўданімам Ігнат Булава з-пад Турава.

Стар. 4

